ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК
http://www.zgoda.f2s.com

№ 50 (228) 22–29 снежня 2001 г.

MASS MEDIA

ПЛОХОЙ ХОРОШИЙ ПРОДУКТ

АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ

Для кого и кому пишут казенные белорусские журналисты, не является большим секретом. Адресат, пребывающий на К. Маркса, 38, им хорошо известен. Хотя имеется и немалая компания других потребителей государственного информационного продукта.

Судя по рекламным клипам государственных газет, успешно конкурирующим на всех телеканалах с распространением шампуней и прокладок, читатели «Советской Белоруссии», «Рэспублікі» и прочих казенных органов довольны своими изданиями. Чего никак не скажешь о главном потребителе продукции государственных масс-медиа.

«Очень плохой продукт», считает Александр Лукашенко, выдают в свет ему подначаленные средства массовой информации. На совещании 14 декабря досталось на орехи не только редакторам всебелорусских газет. Президент Лукашенко с чувством, с толком, с расстановкой снимал стружку и с министра по делам информации Подгайного. И все из-за того, что, по президентскому мнению, уровень государственных СМИ не соответствует ни российским, ни европейским стандартам.

Не упрекай несправедливо, могли бы сказать своему президенту многочисленные читатели «СБ», «ЗЮ», «НГ», «Р» и других менее заметных, но очень государственных газет. На них не только подписываются за казенный кошт, но их даже покупают за свои кровные в газетных киосках «Белсоюзпечати» и «Белпочты».

Зато с Александром Лукашенко насчет качества президентских газет полностью солидарны белорусские гости из ближнего зарубежья. Они страшно удивляются, познакомившись с продукцией государственных СМИ. «У вас *остановилось время*», — это еще самый мягкий комментарий услышанного ими по казенному радио, увиденного по БТ или прочитанного в каком-либо печатном органе.

Постсоветские иностранцы с изумлением обнаруживают, что лукашенковские СМИ работают точь-в-точь в стилистике и по методике печатных органов незабвенной КПСС. Оказывается, несмотря на политические и экономические пертурбации 10 посткоммунистических лет, у белорусов все еще есть коллективные организаторы и пропагандисты.

Как встарь, на страницах государственных газет и в программах БТ лучшее неустанно борется с хорошим. Почти всегда в роли лучшего начала выступает внутренняя политика под мудрым водительством президента Лукашенко. Внутренняя экономика тоже хороша, хотя кое-где у нас порой в ней имеются отдельные недостатки.

А вот за границей творятся невообразимые страхи в политике и экономике. Особым образом усердствует казенная журналистика по поводу постсоветского зарубежья. Теперь больше всего достается соседям из посткоммунистической Прибалтики. А до недавнего времени в рейтинге зарубежных страшилок лидировали российские экономические неурядицы.

Совсем не за белорусские новости ценят свои газеты государственные читатели. Главное – убедиться, что все у них идет, как надо. Везде плохо, и только в их царстве-государстве все хорошо. Превыше всего ценят свой душевный комфорт потребители государственного информационного продукта.

Напрасно Александр Лукашенко упрекал информационных чиновников в недовыполнении руководящих указаний. Госзаказ президентскими СМИ исполняется и перевыполняется. Достаточно пройтись ближе к обеду по столичным газетным киоскам, чтобы убедиться в устойчивой популярности основных государственных изданий.

Глупым иностранцам и почему-то примкнувшему к ним президенту Лукашенко невдомек, что так и надо. Преданным читателям, слушателям и зрителям государственных СМИ нужно каждый день убеждаться, что они живут в чудесной стране, которой руководит лучший в мире президент.

Точно так же советским читателям было необходимо знать, что все трудности преходящи. Не за горами и коммунизм, когда каждому наконец достанется по потребности и о дефиците и очередях можно будет забыть. Поскольку у руководящей и направляющей силы имеется в достатке и ума, и чести, и совести.

Удивительным образом в независимой Беларуси сохранилось громадное количество потребителей пропаганды советского образца. Наверное, правы были коммунистические идеологи, объявившие об успешном формировании *«новой исторической общности – советского народа»*. Спустя 10 лет эта общность все так же испытывает потребность в подтверждении истинности своих политэкономических взглядов. И прежде всего им надо сверить собственные взгляды с мнением начальства.

В свою очередь, казенные СМИ рады потрафить долголетним вкусам и привычкам своей паствы. В государственных белорусских газетах даже сохранились в неизменности и процветают стиль и орфография суконного партийного языка. Упорно заказывается все, что мало-мальски походит на образные средства. Заголовки «Советской Белоруссии» и «Рэспублікі» словно списаны со страниц «Правды» или «Известий» брежневских времен.

Ныне, когда в белорусской экономике объявлена либерализация, интересно наблюдать, как в государственных СМИ тема рыночного социализма уступает место прославлению планового капитализма. Уже теперь понемногу вместо героев социалистического труда *«реального сектора»* на страницах государственных газет появляются передовики капиталистического труда. Очень органично к четким фигурам рабочего и колхозницы добавляются еще неясные силуэты торговца и банкира.

Обширна читательская масса казенных газет и журналов. Еще более велика аудитория Белгостелерадио. Одна беда – не хватает молодежи среди потребителей государственной пропаганды. Серьезно упали, по сравнению с советскими временами, тиражи «Знамени юности» и *«Чырвонай змены»*. Вот здесь-то прав белорусский президент. Среди продуктов хороших попадаются и плохие, и очень плохие. Иначе, почему так мало государственных читателей переходного возраста? ■

КОЛОНКА РЕДАКТОРА

Накануне

АЛЕКСЕЙ КОРОЛЬ

За годом год мы пролистываем календарь своей жизни. Когда удачно, когда и не очень. Удача, успех – это, прежде всего, результат наших собственных усилий. Но зачастую не все и не всегда зависит от нас. Если плохо стране – плохо и ее гражданам. Уже сколько лет подряд львиная доля усилий тратится каждым из нас на борьбу за выживание, на удержание прошлогоднего уровня, на сохранение того, что имеем. Речь о сильных, здоровых и дееспособных. А что уж говорить о тех, кому судьба уготовила испытание, не обошла бедой. Каково им в неустроенном государстве, неспособном обеспечить нормальную старость и нормальное детство, нормальный уровень социальной защищенности?

Из года в год власть раздает пустые обещания. По поводу и без повода. Под выборы одни, под выборы вторые, просто так. Все обман и все пустое.

Но не впустую, а во имя сохранения самое себя любимой. Вот уж действительно, если ты не интересуешься политикой, она сама врывается в твой дом.

И все же оставим на время политику, забудем о ней вовсе на Рождество Христово, на Новый год. Вспомним и постараемся следовать в новом году великим заповедям. Отпразднуем приход второго года третьего тысячелетия в семье, с родными, друзьями и близкими. Как всегда, с новыми надеждами, добрыми пожеланиями. И пусть хотя бы часть из них, самых важных, самых нужных, сбудется у каждого из вас.

Ну а мы с вами, дорогие читатели, встретимся уже в 2002 году. Следующий номер газеты выйдет **11 января**. ■

РЕПРЕССИИ

Сполохи 37-го

АЛЕКСАНДР КАВАЛЬСКИЙ

Увольнения, предупреждения, выговоры, лишение премий, отодвигание в очереди на получение жилья — вот неполный перечень мер, применяемых к активистам демократического движения в регионах.

Сто дней старого-нового президента закончились, а в правозащитный центр *«Вясна»* и Белорусский хельсинкский комитет по-прежнему за помощью обращаются люди.

Люди приходят, исчерпав все возможности самостоятельно восстановиться на прежней работе или найти себе новую. Проведя три месяца без денег, имея на руках детей-иждивенцев, они нуждаются не только в юридической помощи, но и в материальной.

Кого-то правозащитникам удалось отстоять. Так, 5 сентября из Кличевского аграрно-технического колледжа с должности преподавателя немецкого языка была уволена Людмила Гуща. Вина была очевидна – работа координатором независимого наблюдения на президентских выборах. Только 22 октября Кличевский районный суд восстановил Людмилу Аркадьевну на работе, а с колледжа взыскал оплату вынужденного прогула и возмещение морального вреда в сумме 46250 рублей. Дополнительно колледжу пришлось оплатить судебные издержки в размере 15000 рублей. Таким образом, за полтора месяца издевательства над человеком директор из бюджета своего учебного заведения отсчитал скромную сумму в 40 у. е. Остановит ли его в следующий раз такое смехотворное наказание?

Помогли и жительнице Слуцкого района Зинаиде Тимошек. Ее оштрафовали на 37500 рублей за то, что она находилась в автомобиле (в качестве пассажира), где ГАИшники обнаружили спецвыпуски газет без выходных данных. 26 октября суд отменил решение административной комиссии при Слуцком райисполкоме как незаконное.

К сожалению, такие случаи не очень часты. Как правило, даже абсурдные решения судов остаются в силе. *«Згода»* уже писала об увольнении социального педагога СШ №1 в Крупках Андрея Алехновича за *«поступок, несовместимый со званием учителя»*. Как районный, так и областной суды подтвердили правильность решения руководства РОНО. Это дело очень интересно узаконенными мотивировками запрета на профессию.

➲Окончание на стр. 3

АНЕКДОТ-С

– Я вам гарантирую свободу слова, – обещает президент на совещании с редакторами государственных газет.

– А что будет тому, кто это слово скажет? – думают газетчики и, как всегда, соглашаются с президентом.

* * *

– Кто лучше всех знает, что земля круглая?

– Журналисты государственных газет. Потому что все помои, которые они льют на Запад, льются на них с Востока из московских газет.

* * *

– Что общего между милиционером, гинекологом и журналистом государственной газеты?

– Все они работают в органах.

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ

«Александр Лукашенко провел активную мозговую атаку на местном и верхнем уровне»

(В. Ловгач, «Республика», 19.12.01)



«Особенно популярны пограничные состояния – нервные срывы, стрессы, хроническая усталость»

(М. Павлов, «Минский курьер», 19.12.01)

«Молодежь, увы, не знает, что метро минское создавала вся великая страна»

(О. Степаненко, «Белорусская нива», 19.12.01)

НАВІНЫ

Прафсаюзы. Прэзідыум Федэрацыі прафсаюзаў беларускай выступіў з заявай наконт пастановы № 1804 Савета міністраў «Аб мерах па абароне правоў сябраў прафесійных саюзаў». Пастанова саўміну прадугледжвае забарону прынятай формы адлічэння прафсаюзных унёскаў праз бухгалтэрыі прадпрыемстваў на рахункі прафсаюзных пярвічак. Зараз сябры прафсаюзаў мусяць асабіста плаціць унёскі, што значна ўскладняе сам працэс збору грошаў. На думку кіраўніцтва ФПБ, гэты акт накіраваны не толькі на барацьбу з прафсаюзамі, але і супраць усіх працоўных. Пад пагрозай закрыцця аказаліся сотні сацыяльных установ: бібліятэкі, палацы культуры, спартыўныя школы. Акрамя таго, пастанова ўраду супярэчыць галіновым тарыфным пагадненьням, калектыўным дамовам, арт. 107 Працоўнага кодэкса, арт. 117 ч. 2 Грамадзянскага кодэкса, Канстытуцыі і міжнародна-прававым актам. На думку Уладзіміра Ганчарыка, калі ўлада гэтым крокам хацела ўнесьці дадатковы раскол у шэрагі ФПБ, то на гэты раз пралічылася. Пастанова толькі пасадзейнічае кансалідацыі прафсаюзных арганізацыяў.

Акцыя. 16 снежня ў Мастах Гродзенскай вобласці актывісты Маладой грамады і Маладога фронта правялі акцыю «Хочам ведаць праўду». З партрэтамі бясследна зніклых Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, Андрэя Завадскага яны раздавалі мінакам апазіцыйную літаратуру і ўлёткі. Улётку атрымаў нават начальнік мясцовай міліцыі. На гэты раз абышлося без затрыманняў і арыштаў.

Валюта. Курс долара ЗША зноў вырос на ўсіх сегментах валютнага рынка. На ўнутраным пазабіржавым безнаяўным рынку ён узрос на 1 працэнт (з 1555–1560 да 1570–1575 рублёў). На таргах Беларускай валютна-фондавай біржы курс долара ЗША павялічыўся на 0,8 працэнта, еўра – на 1,8 працэнта. У абменных пунктах камерцыйных банкаў кошт амерыканскай валюты павысіўся на 0,6 працэнта. На «чорным» рынку курс пакупкі наяўнай валюты дасягнуў 1580 рублёў.

Сесія ААН. 56-я сесія Генеральнай Асамблеі ААН аднагалосна прыняла рэзалюцыю «Умацаванне міжнароднага супрацоўніцтва і каардынацыя высілкаў у вывучэнні, памягчэнні і мінімізацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы». Як паведаміла прэс-служба МЗС Беларусі, да сааўтараў гэтага дакумента, ініцыяванага дэлегацыямі Беларусі, Расіі і Украіны, далучыліся 34 дзяржавы-сябры ААН. Рэзалюцыя пацвердзіла доўгатэрміновы характар наступстваў чарнобыльскай катастрофы, якія патрабуюць для свайго вырашэння шырокага і актыўнага міжнароднага супрацоўніцтва і каардынацыі высілкаў. Рэзалюцыя прапануе ўсім дзяржавам, а таксама адпаведным фондам і праграмам сістэмы ААН працягваць падтрымку намаганняў па ліквідацыі наступстваў катастрофы Беларусі, Украіны і Расіі, як найбольш пацярпелых, у тым ліку падтрымліваць дадатковымі сродкамі медыцынскія, сацыяльныя, эканамічныя і экалагічныя праграмы, непасрэдна звязаныя з чарнобыльскай аварыяй.

Беларускае кіно. 17 снежня ў сталічным кінатэатры «Масква» прайшла ўрачыстая вечарына, прысвечаная Дню беларускага кіно. Галоўнай падзеяй вечара стала дэманстрацыя поўнаметражнай мастацкай стужкі «Свежына з салютам», які здымаўся на нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» у гэтым годзе. Беларускамоўная камедыя «Свежына з салютам», лубок аб сельскім жыцці, – дэбют маладога рэжысёра Івана Паўлава. У стужцы здымаліся толькі беларускія артысты: Аляксандр Паўлаў, Яўген Лявонцьеў, Генадзь Аўсяннікаў, Алеся Лесьнікава, Валянціна Петрачкова. Музыку да фільма напісаў вядомы беларускі музыкант Зміцер Вайцюшкевіч. Здымкі карціны доўжыліся 9 месяцаў і каштавалі 269 мільёнаў рублёў.

Справа Чыгіра. 19 снежня ў судзе Ленінскага раёна Мінска пачаўся разгляд крымінальнай справы Аляксандра Чыгіра – малодшага сына былога прэм'ер-міністра. Аляксандр Чыгір абвінавачваецца ў крадзяжы аўтамабіля, здзейсненага арганізаванай групоўкай (артыкул 205, частка 4 Крымінальнага кодэкса). Па гэтай справе ў якасці абвінавачаных праходзяць яшчэ 2 чалавекі, якія, нібыта, удзельнічалі ў гэтай групоўцы. Аляксандр Чыгір быў арыштаваны 10 лютага 2001 года на аўтамабільным рынку ў раёне Малінаўка, дзе ён гандляваў аўтазапчасткамі. Ён не лічыць сябе вінаватым. Па меркаванні родных Аляксандра, падставай для гэтай крымінальнай справы стала палітыка, а менавіта апазіцыйная дзейнасць Міхаіла Чыгіра і яго ўдзел у прэзідэнцкай кампаніі.

Беларусь–Украіна. Стан і перспектывы гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі і Украіны абмяркоўваліся на сёмым паседжанні міжурадавай беларуска-украінскай камісіі, якое адчынілася ў Чарнігаве 17 снежня. Беларускую дэлегацыю ўзначаліў намеснік прэм'ер-міністра Сяргей Сідорскі. Па інфармацыі Міністэрства замежных спраў, на працягу двух дзён удзельнікі паседжання абмяркоўвалі магчымасці развіцця супрацоўніцтва Беларусі і Украіны ў аграпрамысловым комплексе, транспарце, міжрэгіянальных сувязях, вытворчай кааперацыі. У паседжанні прынялі ўдзел кіраўнікі ўрадаў дзвюх краін – Генадзь Навіцкі і Анатоль Кінах. На выніках сустрэчы былі падпісаны пагадненні паміж Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва Беларусі і Дзяржбудам Украіны аб каардынацыі распрацоўкі горадабудаўнічых праграм развіцця памежных тэрыторый; аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве паміж Брэсцкім аблвыканкамам і адміністрацыяй Чаркаскай вобласці.

Для ўдзелу ў сустрэчы дзелавых колаў Беларусі і Украіны 18 снежня ў Чарнігаў паехалі прэзідэнт Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір Баброў, гендырэктар Гомельскага аддзялення БелГПП Васіль Старавойтаў і прадстаўнікі каля 30 беларускіх прадпрыемстваў і арганізацый, у тым ліку «Гомсельмаша», «Мазырсолі», «Лідсельмаша», «Бабруйскаграмаша», «Гомельшкла», Навагрудскага завода газавай апаратуры і іншыя.

СЪЕЗДЫ

Два года без Зенона

АЛЕКСАНДР КАВАЛЬСКИЙ

Съезд партии БНФ, который замыкал череду декабрьских партийных форумов, обещал стать острым и зрелищным, но не стал ни тем, ни другим. Зато у него были свои достоинства.

Съезды Белорусского народного фронта всегда были эталонными. Первый, прошедший в Вильнюсе, стал образцовым по зрелищности и воодушевлению делегатов. Учредители движения собрались в древней столице ВКЛ, кривицкой Мекке, под национальными бело-красно-белыми стягами. А у белорусских коммунистов руки уже были коротки дотянуться до Вильни и остановить *«националистический шабаш»*.

Показав в 1989 чудеса сплоченности, через 10 лет Фронт продемонстрировал всем образец партийного раскола. Как в хорошем итальянском кино о разводе: со скандалами, хлопаньем дверями, дележом имущества и названия, разбирательствами в суде.

У пятого съезда партии БНФ, прошедшего 15–16 декабря в ДК «Сукно», также есть чему поучиться. Первое достоинство форума – несмотря на серьезный партийный конфликт между сторонниками Винцука Вечерко и Вячеслава Сивчика, выступления с трибуны напоминали дискуссию в Палате лордов. Это вовсе не значит, что речи делегатов были лишены запала и остроты, просто разговор был переведен из плоскости персоналий в плоскость программ. Платформа, с которой переизбирался Винцук Вечерко, оказалась логичнее и понятнее. Красной нитью в ней проходила мысль, что главная задача Фронта – *«избавляться от имиджа пораженцев, создавать имидж победителей»*, для чего неотвратимо партия должна модернизироваться, осовремениваться. Вечерко пообещал товарищам по партии, что БНФ примет участие в местных выборах 2003 года. По мнению председателя, чтобы народ проникся национальной идеей, нужно сначала с ним говорить о его бытовых проблемах, о транспорте, об отоплении и т. д.

Альтернативная программа Вячеслава Сивчика была менее яркой и последовательной. Очень часто казалось, что это был лишь набор лозунгов, обернутых в критическую риторику. Сивчик также не отрицал необходимость модернизации, укрепления партийных структур, но делал упор на сотрудничество с КХП БНФ как идейно близкой организацией. В целом, непримиримых противоречий между двумя платформами не было, так что сыграть в «найдите десять отличий» на их основе было трудно. Поэтому итоги выборов нового председателя БНФ закономерны: из 347 делегатов 246 поддержали Вечерко, за Сивчика свои голоса отдал 81 человек.

Вторым приятным событием стало самовыдвижение на пост заместителя председателя партии Алексея Янукевича. Активист Молодого фронта подготовился по всем правилам: перед съездом провел через прессу («Нашу ниву» и «БДГ») информационную атаку, уже на съезде каждый делегат получил папку с его обращением, программой, ксерокопиями статей и интервью. Такая внутрипартийная кампания – событие вполне заурядное для политической жизни западных демократических партий – у нас прошла впервые. В Беларуси выборы руководящих органов на съездах превращаются в формальность. Все имена заранее обозначены лидерами партий, а делегаты – лишь голосующие статисты на безальтернативных выборах. Случай с Алексеем Янукевичем интересен еще и потому, что это была независимая как от Вечерки, так и от Сивчика фигура.

К сожалению, призвав региональных лидеров к обновлению кадров и привлечению к управлению молодых активистов, Вечерко поступил с точностью до наоборот. Он предпочел увидеть среди своих замов ветеранов: Виктора Ивашкевича (ответственный за политические кампании), Юрия Ходыку (связь с другими партиями и коалициями), Галину Семдянову (внутрипартийная организационная работа). Четвертым замом стал Павел Северинец (связь с молодежью), которому простили его временный союз с Сивчиком и *«клерикализацию»* Молодого фронта, раскритикованную самим Вечерко в отчетном докладе. Не поддержанный руководством Алексей Янукевич в рейтинговом голосовании занял пятое место.

И, наконец, последний важный аспект. Пятый съезд БНФ продемонстрировал партийный застой, о котором, не скрывая, говорили и сами делегаты. Фронт уже не идет в авангарде всех политических процессов. Тем не менее, партийные структуры по-прежнему выглядят вполне однородно и узнаваемо, чего нельзя сказать про большинство других партий.

Среднестатистический белорусский демактивист слабоидеологизирован и вряд ли имеет четкие представления о программных различиях между своей партией и соседями по политическому спектру. Региональные структуры вообще строятся по принципу личных связей и знакомств. Получается не партийная первичка, в которой члены объединены ценностями и положениями, прописанными в уставе, а ватага, собранная вокруг полевого командира. Зачастую такие полевые командиры, не найдя общий язык с центральным руководством, переходят в другие партии. А если полевой командир отходит от политической активности, то организация практически перестает существовать.

БНФ в этом смысле достаточно благополучная партия. Вероятно, благодаря одной простой вещи. Четкий упор на национальную идею, к которой у некоторой части общества есть стабильный интерес, заменяет необходимость такого же четкого позиционирования по другим, более сложным вопросам. В программе БНФ приоритетным является существование национального государства. Но что это такое в плане экономической модели, социальной политики? Рано или поздно даже на сложные вопросы каждая уважающая себя партия должна дать понятные, но содержательные ответы. ■

У АВАНГАРДЗЕ

АНТОСЬ САКОВІЧ

Калі 16 сьнежня дэлегаты VII зьезду БНФ «Адраджэньне» і V зьезду партыі БНФ на чале зь Вячоркам прымалі апошнія рэзалюцыі, на другім канцы гораду адкрываўся яшчэ адзін VII зьезд Беларускага народнага фронту й V зьезд Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ на чале з Пазьняком.

Зьезд праходзіў, па словах арганізатараў, у *«рабочым парадку»*, таму загадзя не анансаваўся. Зянон Пазьняк быў аднагалосна пераабраны лідарам партыі й руху. Ягонымі намесьнікамі сталі спадары Беленькі (ён жа Соймам прызначаны выконваючым абавязкі старшыні), Папкоў і Старчанка. Таксама на зьезьдзе былі сфармаваныя Сойм і Рэвізійная камісія.

Зянон Пазьняк, які можа сьмела прэтэндаваць на месца ў кнізе рэкордаў Гінэса за тое, што ўжо блізу 5 гадоў кіруе партыяй праз факсавы апарат, застаўся верным сваёй традыцыі й прыслаў да зьезду свой справаздачны даклад «Дарога за два гады». Галоўнымі дасягненьнямі КХП з моманту падзелу БНФ, на яго думку, сталі дзьве рэчы. Першае – *«ўратаваньне галоўнай арганізацыі Беларускага Адраджэньня»* (відавочна, што размова вядзецца пра саму КХП). Другое – тое, што партыя *«расьлядоўна й дэталёва раскрыла й растлумачыла антыбеларускую сутнасьць, мэтады й зьмест дзейнасьці Ганса-Георга Віка, паставіла ёй заслон і фактычна дамагася яго выдаленьня з нашай краіны»*.

Недахопамі працы КХП Зянон Пазьняк назваў правал рэалізацыі ідэяў стварэньня Грамадзянскага парляманту й законнага Беларускага ўраду, а таксама нездавальняльныя вынікі збору подпісаў за рэгістрацыю яго як кандыдата ў прэзыдэнты. Тым ня менш, на яго думку, сытуацыю ў краіне пасьля выбараў можна ахарактарызаваць хутчэй як банальную, чым як катастрафічную. Праблема палягае толькі ў тым, каб прадаставіць людзям годную альтэрнатыву Лукашэнку. Такой альтэрнатывай мае стаць Беларуская Салідарнасьць, новы нацыянальна-вызвольны рух, які мусіць вярнуцца да клясычнага лёзунгу нацыянальнага Адраджэньня: праз асьвету – да свабоды.

Больш падрабязна новыя падыходы партыі патлумачылі намесьнікі старшыні КХП Юры Беленькі й Сяргей Папкоў. Яны зазначылі, што заклікаюць усіх гуртавацца вакол асноўных каштоўнасьцяў: беларуская незалежнасьць, беларуская ўласнасьць і беларуская мова. Але ніякія структуры, кааліцыі для гэтага не патрэбныя. Па словах Сяргея Папкова: *«Мы будзем кансалідавацца, абʼядноўвацца ў працы»*. Што тычыцца канкрэтнай палітычнай дзейнасьці, то КХП будзе дамагацца правядзеньня свабодных і дэмакратычных прэзыдэнцкіх выбараў пад міжнародным пратэктаратам. Рашэньне ж пра ўдзел у мясцовых выбарах пакуль не прымалася.

Больш істотным для сябе лідары КХП лічаць зараз працу па абароне Курапатаў. На Сойме нават была створаная адмысловая камісія, якая будзе стала займацца гэтай праблемай. Юры Беленькі лічыць, што менавіта на курапацкіх крыжах *«сатанінская ўлада зламае сабе шыю»*. Увогуле, на думку намесьнікаў старшыні партыі, КХП фактычна зьяўляецца беларускім палітычным авангардам, які ўвесь час фармулюе прыярытэтныя задачы, а ўжо потым усе падключаюцца да іхнай рэалізацыі.

Застаецца толькі дадаць пра клясычную праблему авангарду. Фармулюючы чарговую прыярытэтную задачу, галоўнае – не забегчы далёка наперад. А то астатнія партыі й простыя выбаршчыкі ўжо настолькі адсталі, што ўвогуле ня бачаць сілуэту КХП на палітычным небасхіле. ■

ПАЛАТА № 2

Старая песьня аб галоўным

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

Дзяржаўны бізнэсплян на 2002 год дэпутаты Палаты прадстаўнікоў узгаднялі доўга, з захаваньнем усіх фармальнасьцяў. Некалькі дзясяткаў палатнікаў не пажадалі добраахвотна адмовіцца ад сваіх паправак нават пасьля абмеркаваньня іх у камісыі па бюджэце і адхіленьня яе старшынёй Сяргеем Кісялёвым.

Верагодна, некаторыя заканатворцы пачалі чытаць адзін з найважнейшых дзярждакумэнтаў, толькі калі надышоў час слухаць яго другім разам. Па-іншаму іх імклівае ўнясеньне паправак у бюджэт напярэдадні ягонага, як меркавалася, канчатковага зацьвярджэньня і ўжо пасьля stationоўчае рэзалюцыі Лукашэнкі патлумачыць немагчыма. Бацькавага подпісу й бяз гэтага давялося чакаць ледзь ня тыдзень. Дэпутаты толькі й займаліся, што пераносеньнем даты абмеркаваньня гатовага дакумэнту. Затое вызваляўся час для ратыфікацыі вялікае колькасьці дамоўленасьцяў з СНДшнымі дзяржавамі.

Калі 14 сьнежня старшыня палаты Папоў урэшце абвясьціў выхад Кісялёва, падавалася, што ўсё пройдзе як па масле. Сапраўды, ужо традыцыйныя пяць капеек па кожным пытаньні Івана Пашкевіча слаба падтрымліваліся астатнімі палатнікамі. Самае вялікае, на што мог разьлічваць кожны, хто настойваў на папраўках, гэта дарадчая прыпіска да асноўнага тэксту Закону аб бюджэце. Адмовілі ў дадатковых выдатках на меліярацыю Гомельскай вобласьці, адмовілі Пашкевічу ў жаданьні бачыць даходы ад гандлю вайсковай тэхнікай прапісанымі ў бюджэце асобным радком. Выключэньнем стаўся дагэтуль шараговы й нічым не прыкметны дэпутат Азарчанкаў, які ўзначальвае камісыю па аграрных пытаньнях. Складана меркаваць, наколькі ён кампэтэнтны ў пытаньнях эфэктыўнага разьвіцьця сельскае гаспадаркі, аднак лішні грошык на гэтае разьвіцьцё ён заўжды выцыганіць. Ягоная прамова наконт скрайняе неабходнасьці дадатковых выратавальных паўадсотка адлічэньняў у фонд падтрымкі сельскае гаспадаркі апынулася настолькі пераканаўчай, што дэпутаты, падпарадкоўваючыся інстынкту забесьпячэньня харчовае бясьпекі ў краіне, пагадзіліся з прапановай Азарчанкава.

Гэтым яны фактычна паказалі Лукашэнку на тое, як няўважліва ён выпраўляе творчасьць сваіх падначаленых. У адказ прэзыдэнт паказаў, наколькі нязначным для яго зьяўляецца меркаваньне дэпутацкае большасьці, адмовіўшыся падпісваць выпраўлены бюджэт. Зрэшты, эксцэс з павелічэньнем субсыдыяў быў вычарпаны ўжо 20 сьнежня. Упартасьць дэпутатаў-аграрыяў была зламаная, Закон аб бюджэце прыняты. Такім чынам, можна ўжо цяпер сказаць некалькі слоў аб эканамічных плянах Беларусі на наступны год.



Рэспубліканскі бюджэт плянуюць напоўніць 3 893 666 100 тысячамі *BYR*. Пры гэтым патраціць мяркуюць ня менш як 4 238 416 100 тысяч *BYR*. Гэта прыблізна адпавядае 2,5 і 2,8 мільярда *USD*. Такія лічбы можна суаднесьці з гадавым балянсам аднае японскае кампаніі, якая спэцыялізуецца ў галіне тэлекамунікацыйных распрацовак.

Дыфіцыт даволі істотны. Калі перавесьці 344 750 000 тысяч *BYR* у амерыканскую валюту і паразмаўляць з Джуліяй Робертс, дык яе штогадовага заробку якраз хапіла б на ліквідацыю гэтае фінансавае дзіркі. Аднак з галівудзкай прыгажуняй Беларусь ня мае сяброўскіх стасункаў, таму фінансаваць дыфіцыт яна мае намер за кошт расійскіх крэдытаў і ўнутраных рэсурсаў. Прычым дапамога ўсходняга суседа больш рэальная, чым пляны заканатворцаў і рэцэнзентаў «Бюджэту-2002». Вымушаны будзе дапамагчы крэдытамі дзяржаве Нацбанк, тое-сёе ўлады атрымаюць шляхам грашова-крэдытных маніпуляцыяў. Значна менш спадзяваньняў на высокія каціроўкі дзяржаўных кароткатэрміновых аблігацыяў (ДКА) ды іншых каштоўных папер, а таксама іх папулярнасьць у насельніцтва. Аднак гандаль ДКА пазначаны адным з асноўных сродкаў для ўраўнаважаньня беларускіх даходаў і выдаткаў.

Дэфіцыт не павялічыцца, калі будуць атрыманыя ўсе плянавыя даходы. Для забесьпячэньня мяркуемага іх ўзроўню давядзецца прадаць ці аддаць ў прыватызацыю тое-сёе зь дзяржаўнае маёмасьці. Прыбытак з такое дзейнасьці не дамінуе ў дзяржбалянсе, складаючы толькі 3 адсоткі. Таму роля фінансавага героя зноў адводзіцца Нацбанку. Ён павінен будзе адлічваць палову свайго прыбытку ў бюджэт краіны, пры гэтым усе даходы ад разьмяшчэньня замежных крэдытаў ураду, у тым ліку і МВФаўскіх, таксама дастануцца дзяржаве. Збольшага, грошы будуць прыносіць падаткі й адлічэньні ва ўсялякія фонды.

Значна больш цікавымі падаюцца артыкулы, на якія дзяржава зьбіраецца грошы траціць. Дзяржава не пакрыўдзіць нікога. Сваё атрымаюць і навукоўцы (амаль сотню мільярдаў *BYR*), прамыславікі, энэргетыкі й будаўнікі (утрая менш), дзяржаўныя сродкі масавае інфармацыі (34 зь лішкам мільярды беларускіх рублёў) і нават чыноўніцтва, што займаецца разьвіцьцём рынкавае інфраструктуры (трошку больш за паўмільярды *BYR*). На падтрыманьне нацыянальнае бясьпекі вылучаецца дваццатая частка ўсяго заробленага дзяржавай. Больш, чым унутраныя войскі і органы па назвычайных сытуацыях, атрымаюць органы ўнутраных спраў. А сельская гаспадарка задаволіцца сваімі 300,4 мільярда *BYR* з фонду падтрымкі сельскае гаспадаркі і яшчэ 42,5 мільярда рублёў, ласкава выдзеленых з агульнарэспубліканскага бюджэту. ■

РЕПРЕССИИ

Сполохи 37-го

Окончание. Начало на стр. 1

Обычно по ст. 47.3 увольняют учителей за аморальные поступки. В этом случае «аморалкой» стало распространение среди детей наклеек организации «Зубр». По мнению заведующего РОНО Анатолия Зайцева, этим Алехнович втягивал детей в *«антигосударственную деятельность, воспитывал нигилизм в отношении государства»*. Прокурор вообще заявил, что выражать свои политические взгляды и недовольство положением в обществе можно только на своей кухне. Возникает резонный вопрос, читал ли прокурор конституцию, пусть себе и с изменениями и дополнениями, внесенными в ноябре 1996 года?

В ходе судебного разбирательства выявились неожиданные обстоятельства. Анатолий Зайцев заявил, что еще 2 ноября 2000 года направлял в КГБ письмо об Алехновиче, чтобы с ним *«разобрались»*. Это письмо Зайцев даже зачитывал в суде и просил приложить к материалам дела. Вот, оказывается, где настоящий оплот моральной чистоты, достойный педагога! Заведующий РОНО не постыдился публично признать, что он стукач и мерзавец. Более того, он этим гордится.

Если кто-то думает, что сполохи кровавого зарева 37-го года видны только в Крупках, спешу разочаровать. Формулировки «за антигосударственную деятельность» стали обыденностью. В ПЦ *«Вясна»* был передан приказ директора Смиловичского сельскохозяйственного техникума:

«В связи с выявлением фактов проведения антигосударственной политики в сельскохозяйственном техникуме (студенческие общежития, учебные корпуса и др.), оскорблением чести и достоинства кандидатов в президенты РБ приказываю – Никитина Виталия Александровича, Никитину Лилию Леонидовну, Кухаренок Валентину Ивановну предупредить о недопустимости распространения на территории техникума брошюр, газет, листовок и другой печатной продукции, в которой унижается честь и достоинство президента РБ, кандидатов в президенты РБ. 05.09.2001 г. Директор техникума Пилуй Н.Ф.».

Одновременно другой преподаватель техникума Александр Никитин был лишен учебных часов. А поскольку он пенсионер, то с ним расторгли контракт и оставили без работы. Так поступили с человеком, работавшим в Смиловичском техникуме с 1964 года. Формально закон нарушен не был: наниматель имел право расторгнуть контракт. Но ведь есть еще и нравственный закон.

Иногда в регионах начальство проявляло завидную расторопность. Руководство Ошмянских электросетей в начале 2001 года заключило контракт с инженером Степаном Корзаном всего на 8 месяцев, а не на 12, как со всеми остальными. Устно ему объяснили, что в стране скоро выборы, а он как член БНФ явно в них будет активно участвовать. Ровно 1 августа срок действия контракта истек, и его не перезаключили. Инженер, у которого в трудовой книжке 92 благодарности, а в семье два ребенка школьного возраста, остался без работы.

Понятно, что судьба уволенного инженера или школьного учителя – это не дело исчезнувшего политика. Тем не менее, это тоже искореженная государством человеческая жизнь. И если закрывать глаза на незаконное увольнение, то можно вскоре не заметить, как страна погрузится в вихрь, казалось бы, пройденных явлений: доносов на соседей, клеймящих резолюций трудовых коллективов, чрезвычайных комиссий и т. п. Как оказалось, почва для этого все еще есть. ■

ПОСТАЦІ

Беларуская Беларусь

ТАЦЬЦЯНА ПАЛЯКОВА

Мой суразмоўца — філосаф Алесь Анціпенка, аўтар і выканаўца шэрагу інтэлектульных праектаў, якія ў свой час рэалізоўваліся Беларускім фондам Сораса. Аўтар артыкулаў

дэнтыфікуюся як эфіёп?

– Тады вы – эфіёп. Але для таго, каб адбываўся працэс самаідэнтыфікацыі, патрэбна сыстэма знакаў альбо сымбаляў. Часам гэ-

ўсе жыцьцё будзеце вымушаны даводзіць астатнім вашую небеларускую сутнасьць.

– Але ўсё ж такі паўстае пытаньне беларускасьці беларускай

турнай тоеснасьці апісаў Купала ў сваёй геніяльнай пьесе «Тутэйшыя». Спэцыяльна падкрэсьліваю слова «геніяльнай», бо ў нашай краіне, на жаль, ёсьць яшчэ

вызначанай рэальным індывідуальным існаваньнем зь ягонымі сацыяльнымі, сацыяльна-псыхалягічнымі, эканамічнымі й проста паобытавымі праблемамі.

– Чаму апазыцыя ня брала пад увагу рэальную эканамічную сытуацыю й рэальныя праблемы людзей?

– Апазыцыя разьлічвала ў хуткім часе прыйсьці да ўлады й тым самым вырашыць усе, у тым ліку й эканамічныя, праблемы. Гэтая падзея мусіла адбыцца на прэзыдэнцкіх выбарах 1994 года. Дастатковай падставай прыходу да ўлады лічылася ідэя незалежнасьці краіны, якую і ўвасабляла ў сабе апазыцыя. Што да выбарцаў, дык значная частка электарату якраз у незалежнасьці Беларусі – разбурэньні СССР (што на той час успрымалася ёй як адно і тое ж), бачыла прычыну пагаршэньня свайго эканамічнага стану.

Увогуле, як цяпер відавочна, адраджэньне было перадусім рамантычным праектам, у якім выразна акрэсьлівалася толькі адно месца – месца палітычна-культурніцкай эліты; прычым, як гэта высьветлілася пазьней, пад элітай трэба было разумець толькі «сьвядомых альбо шчырых беларусаў». Беларускасьць ператварылася ў моцна спалітызаваную ідэялягему.

– А што тады ўяўляе з сябе нацыянальная ідэя?

– Сутнасна нацыянальную ідэю можна вызначыць як праект будучай нацыі й менавіта нацыі як дзяржавы. Нацыянальныя ідэі актуальныя менавіта ў пэрыяды паўставаньня нацыяў-дзяржаваў. Калі нацыя-дзяржава ўжо існуе, нацыянальная ідэя страчвае сваю актульнасьць. Сучасныя французы наўрад ці ведаюць – у чым іх нацыянальная ідэя. Немцы таксама ўжо даўно не рэфлексуюць на гэты конт.

Нацыянальныя ідэі рэалізуюцца ў нацыянальных дзяржавах альбо проста ў факце дзяржаўнасьці той ці іншай нацыі. Для нашай сытуацыі нацыянальная ідэя мае значэньне толькі ў тым сэньсе, што перад намі сапраўды стаіць задача адбудовы заможнай, цывілізаванай і дэмакратычнай краіны. Іншага зьместу гэтая ідэя проста ня мае.

– Часам здаецца, большасьці нашага насельніцтва ўсё роўна, дзе жыць – у беларускай, расейска-беларускай дзяржаве ці ў Расейскай Фэдэрацыі.

– Безумоўна, ёсьць людзі, якія кажуць: «усё роўна, дзе працаваць, абы плацілі грошы». «Усёроўнасьць» дзейнічае там, дзе няма сацыяльных пэрспэктываў, дзе няма канкурэнцыі й высокіх стандартаў жыцьця.

«Усёроўнасьць» у дачыненьні да дзяржаўнасьці азначае, што нацыянальная супольнасьць (патэнцыйная нацыя) адмаўляецца ад права валодаць сваёй тэрыторыяй, сваімі нацыянальнымі багацьцямі й будаваць сваё жыцьцё паводле ўласных традыцыяў, уласнай палітычнай волі й разуменьня. Думаю, што такое адмаўленьне сьведчыць пра стан ненармальнасьці, пра стан «бамжовасьці» сьвядомасьці.

Можна сказаць яшчэ прасьцей: нацыянальная дзяржава гэта – агульны дом для вялікай супольнасьці людзей. Людзям уласьціва мець свой дом. Гэта нармальна. ■

НОВОСТИ СНГ

Азербайджан. В Баку состоялся официальный визит министра обороны США Дональда Рамсфельда. Высокий гость из Вашингтона не преминул отметить, как возросло геополитическое значение Азербайджана после терактов 11 сентября: *«Азербайджан с самого начала поддержал контртеррористическую операцию США в Афганистане, и в этой связи я выразил благодарность президенту Алиеву»*. В ходе встречи с Рамсфельдом стороны затронули и проблему Нагорного Карабаха. Азербайджанские официальные лица упирали на оккупацию 20 процентов территории своей страны и проблему беженцев. На встрече с высоким гостем традиционно прозвучали обвинения в адрес Армении. По словам министра обороны Азербайджана Абиева, *«Армения ведет против Азербайджана террористическую войну: теракты, устроенные армянскими спецслужбами, унесли более 2 тысяч жизней»*. Теперь, как рассчитывают в Баку, американцы должны более сочувственно отнестись к позиции Азербайджана в карабахском вопросе. Особенно Баку интересует расширение военного сотрудничества с Вашингтоном и помощь в модернизации собственных вооруженных сил. Тем временем на 22 декабря в Баку запланирован митинг азербайджанских националистов, требующих решить проблему Карабаха силовым путем.

